# НАШЫ ДАСЯГНЕННІ—ЛЕНІНСКАМУ ЮБІЛЕЮ!


ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1 мая 1935 г.

1980 г. 10 КРАСАВІКА ЧАЦВЕР № 13 (1277)

Выходзіць раз у тыдзень.

Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА


## ТЭЛЕТАЙП

• учора •

• сёння •

• заўтра •

### ДРУГІ ТУР

**Усесаюзнай алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» па фізіцы прайшоў на фізічным факультэце БДУ. Удзельнікамі алімпіяды былі студэнты Мінскага радыётэхнічнага інстытута, Гомельскага універсітэта, Брэсцкага педінстытута і іншых ВНУ рэспублікі.**

**З прывітальным словам да студэнтаў звярнуўся старшыня аргкамітэта алімпіяды прарэктар У. Р. Івашын. Ён пажадаў поспехаў у навуковай рабоце, вучобе, у рашэнні конкурсных задач. У праграме алімпіяды—экскурсія па універсітэту, сустрэчы з вядомымі вучонымі.**

### ЗМЯСТОЎНУЮ РАБОТУ

**праводзіць СНТ юрыдычнага факультэта, якое ўзначальвае студэнт IV курса А. Вышынскі. Тут амаль пры кожнай кафедры створаны навуковыя гурткі. Сярод іх асабліва вызначаюцца: дзяржаўнага і крымінальнага права, псіхалогіі, крыміналістыкі. Цікава праходзяць пасяджэнні гурткоў, дзе студэнты спрачаюцца па праблемах прававой навукі. З цікавымі навуковымі дакладамі выступаюць А. Вашкевіч, І. Шчамялёва, А. Любіч. А навуковая работа Т. Варановіча «Суверэнітэт саюзнай рэспублікі» прадстаўлена на Усесаюзны конкурс навуковых работ.**

### НОВЫЯ КВАТЭРЫ

**атрымаюць сто шэсць супрацоўнікаў і выкладчыкаў універсітэта ў пасёлку Шчомысліца, дзе здадзены ў эксплуатацыю новы шматкватэрны дом з усімі выгодамі.**

**На днях адбудзецца ўрачыстае ўручэнне ключоў і ордэраў на новыя кватэры.**

### АБ НАСЦЕННЫМ ДРУКУ

**на факультэтах гаварылася на апошнім пасяджэнні камісіі па нагляднай агітацыі БДУ. У ліку лепшых адзначаны факультэты фізічны, біялагічны, гістарычны, журналістыкі. Партыйным бюро ФПМ і мехмата была звернута ўвага на ўзмацненне кіраўніцтва насценным друкам.**

## УЗНАГАРОДА РАДУЕ І НАТХНЯЕ

**У Палацы культуры чыгуначнікаў імя Ільіча адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны ўручэнню Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту імя У. І. Леніна пераходнага Чырвонага сцяга Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за 1979 год.**

**Вось што паведамілі аб гэтай падзеі нашы спецыяльныя карэспандэнты:**



...У святочным убранні Палац культуры чыгуначнікаў імя Ільіча. Тут сабраліся выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты—прадстаўнікі шматтысячнай універсітэцкай сям'і,—творчымі намаганнямі якіх, нястомным пошукам здабыта перамога. Сярод прысутных пануе прыўзняты настрой, святочная атмасфера. На сцэну падымаюцца прадстаўнікі рэктарата і грамадскіх арганізацый, вядомыя вучоныя, выдатнікі вучобы, ганаровыя госці. Урачысты сход аб'яўляецца адкрытым.

Слова прадастаўляецца начальніку ўпраўлення выкладання грамадскіх навук Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР А. М. Каршунову.

— Таварышы! Мне выпаў вялікі гонар уручыць вам пераходны Чырвоны сцяг Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў, якога вы ўдастоены за поспехі ў сацыялістычным спаборніцтве за 1979 год. Мінулы год быў плённым для вашага калектыву.

Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна, уключыўшыся ў сацыялістычнае спаборніцтва за дастойнае выкананне заданняў чацвёртага года дзесятай пяцігодкі, прыняў канкрэтныя абавязацельствы, накіраваныя на рэалізацыю рашэнняў XXV з'езда КПСС па далейшаму развіццю навукі, падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі, камуністычнаму выхаванню студэнцкай моладзі.

У 1979 годзе ў рамках універсітэцкага спаборніцтва праведзены агляды-конкурсы: мастацкай самадзейнасці супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта, насценнага друку, нагляднай агітацыі, конкурс на лепшую студэнцкую акадэмічную групу, лепшы студэнцкі будаўнічы атрад, лепшую арганізацыю аховы працы і тэхнікі бяспекі, агульнауніверсітэцкая спартакіяда «Здароўе» і інш.

Універсітэт выканаў планы прыёму і выпуску спецыялістаў.

У арганізацыі і здзяйсненні сацыялістычнага спаборніцтва асаблівая ўвага звярталася на выкананне плана падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі навукова-педагагічных кадраў.

У выніку за 1979 год супрацоўнікамі універсітэта абаронены 2 доктарскія і 54 кандыдацкія дысертацыі (150 працэнтаў у параўнанні з 1978 годам). План прыёму ў аспірантуру выкананы на 100 працэнтаў. З ліку скончыўшых аспірантуру 5 чалавек абаранілі кандыдацкія дысертацыі датэрмінова. Стажыроўку і павышэнне кваліфікацыі прайшлі 302 чалавекі, што складае 106,7 працэнта да плана.

Вялікае мёсца ў сацыялістычным спаборніцтве займалі пытанні павышэння эфектыўнасці вучэбнага працэсу, павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Паспяхова рашаліся пытанні шырокага выкарыстання новых прагрэсіўных форм і метадаў вучэбна-выхаваўчай работы з выкарыстаннем ТСН. Пры гэтым галоўная ўвага ўдзялялася іх комплекснаму выкарыстанню, стварэнню аўтаматызаваных аўдыторый і класаў, кінафікацыі вучэбнага працэсу, укараненню сродкаў відэа- і гуказапісу, вучэбнага тэлебачання, дыяпраекцыйных сродкаў, распрацоўцы дыдактычных матэрыялаў.

У 1979 годзе сродкамі тэхнічнага навучання абсталявана 6 аўдыторый, створаны 2 лінгафонныя кабінеты, змантыравана і запушчана кінаўстаноўка, расшырана і ўдасканалена замкнутая тэлевізійная сістэма і тэлестудыя прагляду на 100 месц на факультэце журналістыкі.

У цяперашні час ва універсітэце ёсць 21 аўдыторыя, 14 класаў, кабінетаў і лабараторый, якія абсталяваны сучаснымі ТСН, 6 аўтаматызаваных класаў кантролю ведаў, 3 камплекты кантралюючых прылад тыпу «Агеньчык-1» на 15 пультаў кожны, 100 кантралюючых прылад тыпу БПІ-2, 17 лінгафонных кабінетаў; аўтаматызаваны навучаючы клас на 16 пультаў на базе ЭВМ «Мінск-32», 4 лабараторыі малых ЭВМ. Аўтаматызаваныя і кінафікаваныя аўдыторыі ёсць на ўсіх факультэтах, дзвюх кафедрах гісторыі КПСС, у Інстытуце павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук пры БДУ.

Значна расшырылася выкарыстанне вучэбнага кіно. У 1979 годзе фонд фільматэкі універсітэта павялічыўся на 160 кінафільмаў і кінафрагментаў. Сіламі выкладчыкаў створана 7 вучэбных кінафільмаў.

У 1979 годзе ва універсітэце праведзены два агляды-конкурсы па прымяненню ТСН у вучэбным працэсе. Вынікі конкурсу садзейнічалі аператыўнай ліквідацыі недахопаў у прамяненні ТСН, шырокаму распаўсюджанню перадавога вопыту.

Шырокае кола пытанняў, звязаных з павышэннем якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, было абмеркавана на III агульнауніверсітэцкай навукова-метадычнай канферэнцыі «Актуальныя праблемы ўдасканальвання вучэбна-выхаваўчага працэсу».

Далейшае развіццё атрымалі розныя формы інтэграцыі універсітэта з навукова-даследчымі ўстановамі і прамысловымі прадпрыемствамі г. Мінска і рэспублікі.

На аснове дагавораў аб супрацоўніцтве універсітэт здзяйсняў мэтавую падрыхтоўку спецыялістаў па мікраэлектроніцы, фізічнай электроніцы, спецыялістаў-хімікаў і інш. Студэнты шэрагу спецыяльнасцей значную частку лабараторных і практычных заняткаў праводзілі ў навуковых лабараторыях інстытутаў АН БССР, на базе вытворчых аб'яднанняў, у якія яны потым размяркоўваліся на працу.

Надаючы вялікае значэнне вытворчай практыцы студэнтаў як аднаму з галоўных звенняў у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, універсітэт у 1979 годзе асвоіў шэраг новых баз практыкі на перадавых вытворчых аб'яднаннях і прадпрыемствах Міністэрства радыёэлектроннай, нафтавай і хімічнай прамысловасці, у галіновых НДІ.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

**ТЭЛЕГРАМА**

**МІНСК, БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ, РЭКТАРУ, АКАДЭМІКУ АН БССР У. А. БЕЛАМУ.**

**Прэзідыум, партыйны камітэт, аб'яднаны камітэт прафсаюза і камітэт камсамола Акадэміі навук БССР горача і сардэчна віншуюць шматтысячны калектыў студэнтаў і выкладчыкаў з важнай падзеяй — уручэннем універсітэту пераходнага Чырвонага сцяга Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза.**

**Жадаем вам, дарагія таварышы, новых поспехаў у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі краіны і развіцці савецкай навукі.**

**ПРЭЗІДЫУМ
ПАРТКОМ
АБ'ЯДНАНЫ КАМІТЭТ ПРАФСАЮЗА
КАМІТЭТ КАМСАМОЛА АН БССР.**

# УЗНАГАРОДА РАДУЕ І НАТХНЯЕ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).**

Вялікая работа праведзена па ўдасканаленню ідэйна-палітычнага выхавання студэнтаў, усяго калектыву універсітэта. Паспяхова здзяйснялася распрацаваная ў БДУ комплексная праграма ідэйна-выхаваўчай работы сярод студэнтаў на ўвесь тэрмін навучання. Важнае месца ў камуністычным выхаванні займала грамадска-палітычная практыка, якую праходзілі ўсе студэнты універсітэта. Створана стройная сістэма марксісцка-ленінскай адукацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоўнікаў універсітэта, павышэння іх ідэйна-палітычнага ўзроўню.

У саставе БДУ імя У. І. Леніна навукова-даследчую работу праводзяць навукова-даследчая частка, навукова-даследчы інстытут прыкладных фізічных праблем імя А. М. Сеўчанкі, навукова-даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем, навуковыя праблемныя лабараторыі, а таксама прафесарска-выкладчыцкі састаў універсітэта.

Распрацоўваецца тэматыка па 41 навуковаму напрамку. Тэматыка НДР вырашае важныя навукова-тэхнічныя праблемы народнай гаспадаркі. Па важнейшай тэматыцы выконваецца 64 дагаворныя і 67 дзяржбюджэтных тэм. Планы ўсіх дзяржбюджэтных НДР скаардынаваны з планамі даследаванняў АН СССР і АН БССР. Звыш 95 працэнтаў работ накіравана на стварэнне аб'ектаў новай тэхнікі і тэхналогіі. Большасць з аховаздольных тэм выконваецца з элементамі новых тэхнічных рашэнняў на ўзроўні вынаходніцтваў. У 1979 годзе ўдзельная вага такіх работ склала 76 працэнтаў — атрымана 157 станоўчых рашэнняў на вынаходніцтвы.

Рэалізацыя шматлікіх распрацовак дала значны эканамічны эфект. Навуковыя экспанаты атрымалі на ВДНГ СССР 11 медалёў, атрымана 10 дыпломаў ВДНГ БССР.

У 1979 годзе ДК СМ СССР па справах вынаходніцтваў і адкрыццяў зарэгістраваў за № 224 адкрыццё прафесара кафедры ядзернай фізікі У. Р. Барышэўскага «Ядзерная працэсія нейтронаў».

Усімі формамі НДР было ахоплена 7611 студэнтаў, што склала 78 працэнтаў ад агульнай колькасці студэнтаў дзённай формы навучання. Студэнты Белдзяржуніверсітэта прымаюць удзел у рашэнні важных народнагаспадарчых задач, працуючы над гасдагаворнымі і дзяржбюджэтнымі тэмамі. Аб'ём работ, выконваемых студэнцкімі навукова-даследчымі лабараторыямі, склаў 150 тысяч рублёў. Больш як 60 дыпломных і курсавых работ рэкамендавана да ўкаранення ў вытворчасць ці ў вучэбны працэс. Студэнтамі універсітэта самастойна і ў сааўтарстве апублікаваны 173 работы, атрымана 9 аўтарскіх пасведчанняў.

Ва універсітэце распрацаваны план лячэбна-аздараўленчых мерапрыемстваў, адпаведна з якім рэгулярна праводзіцца прафілактычны агляд студэнтаў. У 1979 годзе ў санаторыях папраўілі сваё здароўе 75 студэнтаў, знаходзіліся ў дамах адпачынку і пансіянатах 95 студэнтаў.

Вялікую ролю ў арганізацыі адпачынку іграе работа міжвузаўскага санаторыя-прафілакторыя, дзе за год пабывала 850 студэнтаў. На возеры Нарач працуе спартыўна-аздараўленчы лагер, у якім за тры змены адпачыла 750 студэнтаў. У 1979 годзе ў гэтым лагеры завершана будаўніцтва 4 жылых домікаў на 48 месц, адрамантаваны памяшканні, спортпляцоўкі, набыты новы спортінвентар, па-новаму аформлена наглядная агітацыя. У 1979 годзе спартыўна-аздараўленчы лагер універсітэта заняў першае месца сярод ВНУ горада Мінска.

У мінулым годзе для прафесарска-выкладчыцкага саставу пабудаваны 107-кватэрны жылы дом. Акрамя гэтага, уведзены ў дзеянне вучэбна-лабараторны корпус у п. Шчомысліца з карысной плошчай 13000 квадратных метраў.

У працоўным семестры 1979 года ў саставе зводнага СБА працавала 2705 студэнтаў. Іх рукамі ўзводзіліся жылыя дамы, школы, жывёлагадоўчыя памяшканні ў Беларусі і Казахстане, Карэліі і Пскоўскай вобласці. Студэнты універсітэта ўдзельнічалі на ўборцы гародніны і фруктаў у Малдавіі, у будаўніцтве магістралі веку— БАМа. Байцамі СБА было асвоена 7.149 млн. рублёў капітальных укладанняў, у тым ліку 1.161 млн. на будоўлях Мінскай вобласці. З прынятага да будаўніцтва 171 аб'екта 92 здадзены ў эксплуатацыю, прычым 15 — са «Студэнцкім знакам якасці».

СБА універсітэта праведзена вялікая грамадска-палітычная работа. Байцамі прачытана 1843 лекцыі, дадзена 937 канцэртаў. У Міжнародны год дзіцяці адным з галоўных напрамкаў дзейнасці атрадаў была работа з дзецьмі. Пры СБА універсітэта працавала 67 піянерскіх лагераў, у якіх адпачыла 598 дзяцей. Школьным бібліятэкам перададзена 24 тысячы кніг. Байцамі СБА адрамантавана 70 школ, абсталяваны 92 спецкабінеты.

У атрадах была прадоўжана работа па стварэнню «Летапісу народнай славы». Байцы СБА шэфствавалі над 104 помнікамі і абеліскамі, аказалі дапамогу 452 ветэранам вайны і працы.

Дзейнасць СБА універсітэта атрымала высокую ацэнку партыйных, савецкіх і камсамольскіх органаў. Па выніках трэцяга працоўнага семестра 1979 года камсамольская арганізацыя універсітэта выйшла пераможцай сацыялістычнага спаборніцтва ў вобласці і рэспубліцы.

Увогуле вынікі вашай працы добрыя. І гэта ганаровая ўзнагарода абавязвае вас яшчэ больш настойліва ўдасканальваць сваю дзейнасць. Дазвольце выказаць упэўненасць, што калектыў універсітэта накіруе ўсе свае веды, вопыт і энергію на паспяховае выкананне заданняў апошняга года дзесятай пяцігодкі.

А. М. Каршуноў пад дружныя апладысменты ўдзельнікаў сходу ўручае пераходны Чырвоны сцяг Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў.

Слова прадастаўляецца рэктару універсітэта акадэміку АН БССР У. А. Беламу.

— Паважаныя таварышы! Дазвольце мне ў гэты ўрачысты час — час уручэння нам пераходнага Чырвонага сцяга Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і Цэнтральнага Камітэта нашага прафсаюза, па даручэнню партыйнай і прафсаюзнай арганізацый, ад імя ўсяго калектыву ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя Уладзіміра Ільіча Леніна першыя словы сардэчнай падзякі выказаць нашай роднай Камуністычнай партыі, якая заўсёды праяўляла і праяўляе вялікую ўвагу і клопат аб развіцці вышэйшай адукацыі, навукі і культуры ў нашай краіне. Толькі дзякуючы паўсядзённай увазе з боку партыйных арганізацый да універсітэта наш калектыў змог дабіцца такіх высокіх паказчыкаў у сацыялістычным спаборніцтве сярод усіх ВНУ краіны.



Нам асабліва прыемна, што гэту ўзнагароду мы атрымліваем незадоўга да вялікага ўсенароднага свята — 110-й гадавіны з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна, імя якога з гонарам носіць наш універсітэт.

У гэтым сцягу, які сатканы з дзесяткаў тысяч чырвоных ніпак, як бы сімвалічна пераплятаецца праца кожнага са шматлікіх супрацоўнікаў і студэнтаў нашага калектыву.

Таму кожнаму з нас, прафесару і студэнту, рабочаму і навуковаму супрацоўніку, бібліёграфу і аспіранту — усім нам прыемна бачыць здабыткі сваёй сціплай працы, удастоенай такой высокай ацэнкі.

Я думаю, мне няма неабходнасці зараз з гэтай высокай трыбуны пералічваць нашы поспехі і дасягненні, аб якіх так шчодра і пахвальна гаварыў у сваім выступленні Анатоль Міхайлавіч Каршуноў.

Сёння з вяршыні пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва мы павінны бачыць не толькі далёкія гарызонты перспектыў развіцця універсітэта, але і нашы сённяшнія задачы, мы павінны па-сапраўднаму ацаніць гэту высокую ўзнагароду і глыбока ўсвядоміць, што ўтрымаць яе нам будзе цяжка. А нам трэба, абавязкова трэба гэта зрабіць, бо ў будучым, 1981 годзе, мы будзем адзначаць 60-годдзе з дня заснавання нашага універсітэта, і зразумела, усе мы жадаем, каб у прэзідыуме юбілейнага сходу на гэтым жа ганаровым месцы стаяў цудоўны сцяг пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва.

У гэтым кароткім выступленні цяжка акрэсліць задачы, якія належыць рашаць нашаму калектыву сёння, заўтра і паслязаўтра.

Усе гэтыя задачы накіраваны на выкананне рашэнняў XXV з'езда КПСС. Мы павінны рыхтаваць нашых выхаванцаў так, каб кожны з іх стаў чалавекам, які добра валодае асновамі марксісцка-ленінскага вучэння, які ясна бачыць палітычныя мэты партыі, мае шырокую навуковую і практычную падрыхтоўку, дасканала валодае сваёй спецыяльнасцю. І, вядома, сённяшні выпускнік павінен быць чалавекам высокай культуры, шырокай эрудыцыі, увогуле ён павінен быць сапраўдным інтэлігентам новага сацыялістычнага грамадства.

Для гэтага прафесарска-выкладчыцкі калектыў універсітэта павінен павысіць эфектыўнасць усёй вучэбна-выхаваўчай і навукова-метадычнай работы.

Мы павінны памятаць, што універсітэты заўсёды былі, ёсць і будуць калыскай фундаментальных даследаванняў, якія, выходзячы з цішыні лабараторый, заяўляюць аб сабе ў поўны голас і адразу ж рэвалюцыянізуюць цэлыя навуковыя напрамкі, тэхналагічныя працэсы, нясуць вялізныя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, вызначаюць тэмпы навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Нам прыемна адзначыць, што наш малады прафесар-фізік Уладзімір Рыгоравіч Барышэўскі ўпершыню ў сістэме ВНУ рэспублікі завяршыў свае шматгадовыя фундаментальныя даследаванні на ўзроўні адкрыцця.

Трэба імкнуцца да таго, каб манаграфіі, аўтарскія пасведчанні, патэнты, прададзеныя ліцэнзіі і адкрыцці сталі паўсядзённай з'явай у жыцці нашага універсітэта.

Вы ведаеце, нам прадастаўлена самае лепшае месца ў горадзе Мінску для будаўніцтва галоўнага вучэбна-навуковага комплекса БДУ—на Ленінскім праспекце. Сумесна з архітэктарамі мы павінны спраектаваць такі цудоўны універсітэцкі комплекс, у якім прыемна было б працаваць не толькі нам, але каб і нашы далёкія нашчадкі з удзячнасцю адклікаліся аб тых, хто сёння праектуе і пачне будаваць гэты комплекс.

Ужо ў гэтым годзе пачнецца будаўніцтва спартыўнага комплекса і інтэрната на 1200 месц. Сёння мы віншуем з наваселлем 106 сем'яў нашых супрацоўнікаў, якія атрымалі новыя кватэры. Такой парой у будучым годзе мы будзем віншаваць з наваселлем нашых супрацоўнікаў у цудоўным новым 120-кватэрным доме, пачнём будаўніцтва яшчэ аднаго 120-кватэрнага дома.

Цяжка пералічыць гэтыя нялёгкія, але прыемныя клопаты па развіццю матэрыяльнай базы універсітэта, якія прадстаіць рашаць нашаму калектыву пад кіраўніцтвам партыйнай, прафсаюзнай арганізацый і рэктарата.

Мы выказваем цвёрдую ўпэўненасць у тым, што калектыў універсітэта, натхнёны высокай ацэнкай яго працы— прысуджэннем яму пераходнага Чырвонага сцяга,—і далей з гонарам будзе апраўдваць званне флагмана вышэйшай школы Беларускай рэспублікі, займаць дастойнае месца ў сузор'і ВНУ і навуковых цэнтраў нашай Радзімы, уносіць важкі ўклад у вялікую справу камуністычнага будаўніцтва.

У заключэнне дазвольце мне па даручэнню ўсяго калектыву Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна горача і сардэчна падзякаваць калегіі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і Прэзідыуму ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў за такую высокую ацэнку нашай працы і запэўніць, што мы прыкладзём усе свае сілы і веды для таго, каб памножыць дасягнутыя вынікі і ўтрымаць гэты сцяг у будучым, юбілейным для нашага калектыву годзе.

Потым выступілі і сардэчна павіншавалі калектыў універсітэта з ганаровай узнагародай міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў, генеральны дырэктар ВА «Інтэграл» П. П. Гайдэнка, рэктар Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага А. Ц. Караткевіч.

Загадчыца кафедры беларускай літаратуры В. В. Казлова, загадчык кафедры ядзернай фізікі С. С. Шушкевіч, студэнтка IV курса механіка-матэматычнага факультэта В. Кошалева выказалі словы шчырай падзякі Радзіме за высокую ацэнку працы калектыву універсітэта. Яны запэўнілі, што выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты будуць працаваць яшчэ больш творча і натхнёна, канкрэтнай справай адкажуць на ганаровую ўзнагароду.

На ўрачыстым сходзе прысутнічалі намеснік загадчыка аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ В. П. Кузьмянкоў, сакратар Мінскага ГК КПБ Н. С. Нерад, загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў Мінскага АК КПБ У. Д. Атрошчанка, сакратар Маскоўскага РК КПБ Р. С. Шылава, старшыня абкома прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў У. П. Кляшняк, сакратар парткома ВА «Інтэграл» Я. В. Варанцоў.

У заключэнне ўрачыстага сходу адбыўся святочны канцэрт мастацкіх калектываў універсітэта.

**А. КОЗЕЛ,**
**М. ДУБОВІК,**
**А. СТАДУБ.**



### ● ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ

**ПЕРШЫ адказ ля дошкі. Якім таямнічым, цікавым і нават трохі страшным здаваўся ён. Першае вялікае адкрыццё свету навукі, адкрыццё сваіх ведаў. Яно працягваецца, гэтае адкрыццё, і ў ВНУ—кожную гадзіну, кожную хвіліну. Як у студэнтак-выдатніц IV курса ФПМ — ленінскага стыпендыята Наташы Герасімёнак і камсорга першай групы Святланы Зубрыцкай. Вы бачыце дзяўчат на практычных занятках. Яны вельмі зацікаўлена вырашаюць праблему аптымальнай перавозкі грузаў...**

**А. МОЗАЛЕВА.**
Фота аўтара.

**ІДЭАЛАГІЧНАЯ РАБОТА ПА МЕСЦУ ЖЫХАРСТВА**

# КЛЮЧ ДА КОЖНАГА

— Ірына Міхайлаўна!

— Як добра, што вы да нас прыйшлі!

— А аб чым вы нам сёння раскажаце?

— А можа, мы куды пойдзем?..

Яны бягуць ёй насустрач. І, ледзь паспеўшы павітацца, наперабой пачынаюць расказваць аб сваіх навінах. А потым пытанні. Іх шмат, і самых розных. На кожнае з іх Ірына імкнецца адказаць як мага паўней. Калі ж усе пытанні вырашаны, пачынае праводзіць палітінфармацыю або расказваць што-небудзь цікавае. У класе стаіць цішыня. Дзеці, затаіўшы дыханне, слухаюць уважліва, з інтарэсам. Доўга ў класе не змаўкае яе голас.

...4-ы «А» клас 101-й школы горада Мінска. Тут яе любяць і паважаюць. Прыходзіць Ірына кожны тыдзень, а калі і часцей. І яшчэ не было такога, каб яна прыйшла непадрыхтаванай. Сорамна? Вядома. Яны ж яе так чакаюць! Нават калі тыдзень праходзіць, а яе няма, вучні звоняць ёй дамоў. І калі яна падыходзіць да тэлефона, да яе даносіцца напоўнены сумам голас: «Прыходзьце, калі ласка, мы вас так чакаем». Іра пазнае гэты голас. Гэта Віталік. Адклаўшы ўсё, яна спяшаецца да іх. І зноў перад ёю шчаслівыя твары хлопчыкаў і дзяўчынак.

Іра ўспамінае той час, калі яна ўпершыню збіралася пайсці ў школу. Хвалявалася? Так. Не ведала, як яе сустрэнуць, пра што з імі будзе гаварыць. І вось яна ў класе. Уся ўвага сканцэнтравана на ёй, дзесяткі вачэй пільна сочаць за кожным рухам. «Як і чым іх зацікавіць?», — маланкава праносіліся тады думкі.

...Ёй паверылі з першага знаёмства, да яе пачалі хінуцца. Спачатку толькі дзяўчынкі. Але не прайшло і некалькі тыдняў, як хлопчыкі таксама ўбачылі ў ёй свайго аднадумца.

Увесь час Ірына імкнулася даведацца пра дзяцей як мага больш. Яна памятала, што кожны вучань—гэта індывідуальнасць, і каб яго зразумець, трэба знайсці той «залаты» ключык, які б дапамог гэта зрабіць. І Іра яго знайшла.

Возьмем, напрыклад, Олю Паваротную. Аднойчы Іра заўважыла, што адна дзяўчынка неяк асабліва да яе хінецца. Спыталася пра яе ў класнага кіраўніка Алы Яўгенаўны Савіцкай, з якой, дарэчы, у Ірыны вельмі добрыя адносіны. Аказалася, што ў Олі няма маці. Вось і адчула яе маленькае сэрца тую цеплыню і клапатлівасць, якой ёй так не хапала.

Зараз Іра ведае кожнага. І вельмі дапамагла гэтаму анкета «Мае інтарэсы», якую яна правяла яшчэ ў пачатку знаёмства. Хацелася як мага больш даведацца: пра састаў сям'і, інтарэсы, захапленні і інш. А яшчэ і для таго, каб далей весці работу з улікам іх жаданняў.

Дзеці часта звяртаюцца да Іры і за парадай. Напрыклад, на 8 Сакавіка хлопчыкі спыталі ў яе, як лепш павіншаваць са святам сваіх аднакласніц. Іра прапанавала выпусціць насценгазету. Дапамагла не толькі парадай, але і справай. Газета атрымалася вельмі цікавай, і ўсе былі задаволены.

Шмат часу Іра аддае сваім выхаванцам. Але гэта яе не засмучае. Наадварот. Здавалася, толькі нядаўна прыйшла ў клас упершыню, а колькі зроблена: конкурс малюнкаў «Залатая восень» і «Зімушка-зіма», спартландыя, гутарка «Мужнасць», якая была прысвечана Дню Савецкай Арміі, экскурсіі ў музеі Вялікай Айчыннай вайны і краязнаўчы, ранішнік «Нашы мамы» і многае іншае.

Асабліва цікавай для дзяцей была экскурсія ў заалагічны музей. Іра папярэдзіла, што тут ні да чаго нельга дакранацца рукамі. І яны яе слухаліся. Усё ж калі падышлі да бурага мядзведзя, які ім усім вельмі спадабаўся, не стрымаліся. Але адразу папрасілі прабачэння...

Шмат можна гаварыць аб поспехах у рабоце Ірыны Лапо, студэнткі 2 курса геаграфічнага факультэта.

А поспех гэты—ад любві да дзяцей, жадання працаваць з імі. І таму дзеці з такім нецярпеннем чакаюць сваю важатую, рады кожнай сустрэчы з ёю.

**Н. ЖУКАВА.**

# УЗАЕМНАСЦЬ

ЛЮДМІЛУ ВЕНСКУЮ і Людмілу Чачот піянеры 4-га «В» класа СШ № 67 сустрэлі яшчэ на вуліцы. Радасці гэтых дапытлівых дзяўчынак і хлопчыкаў не было мяжы. Яны штурхалі адзін аднаго і расказвалі пра свае поспехі... Люды ўсміхаліся і, відаць, успаміналі той дзень, калі ўпершыню зайшлі ў гэты клас. Прайшоў час, і цяпер можна з упэўненасцю сказаць, што дзяўчаты паспяхова спраўляюцца са сваімі ганаровымі абавязкамі. Дзяўчатам падабаецца іх работа, яны любяць дзяцей і дзеці плацяць ім тым жа.

...Уважліва слухаюць вучні расказ аб сталіцы нашай Радзімы Маскве, аб падрыхтоўцы да Алімпіяды-80. А як старанна думаюць, зморшчыўшы курносыя насы, і цягнуць руку, каб адказаць на пытанні віктарыны «Займальная матэматыка»! А як перажываюць за лёс Маўглі!..

Так, вялікая фантазія дзяцей. Вялікая іх любоў і павага да добрых і спагадлівых сяброў— Люды Венскай і Люды Чачот, студэнтак механіка-матэматычнага факультэта.

**Т. ДАВЫДЗЁНАК,**
**студэнтка механіка-матэматычнага факультэта.**

**● ДА ДНЯ ГЕОЛАГА**

# *ЗНАЧНЫ ЎКЛАД*

КАЛЯ 500 выпускнікоў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна працуюць у розных структурных падраздзяленнях Упраўлення геалогіі пры СМ БССР і ў даследчых аддзяленнях шэрагу праектных інстытутаў Беларусі. Большасць з іх падрыхтаваны праз завочную і вячэрнюю форму навучання. Такая форма падрыхтоўкі геалагічных кадраў апраўдала сябе і зараз працягваецца на геаграфічным факультэце. У бягучым годзе ў сям'ю беларускіх геолагаў уступіць яшчэ некалькі чалавек.

Супрацоўнікі кафедры глебазнаўства і геалогіі са сваімі выхаванцамі падтрымліваюць самую цесную сувязь. Многія з нашых выпускнікоў з'яўляюцца кіраўнікамі геалагічных атрадаў, партый, экспедыцый, першаадкрывальнікамі шматлікіх месцанараджэнняў карысных выкапняў.

Святкуючы Дзень геолага, наш універсітэт можа ганарыцца сваім важкім укладам у справу падрыхтоўкі кадраў для геалагічнай службы Беларусі.

**Д. КАРУЛІН,**
**прафесар кафедры глебазнаўства і геалогіі,**
**Р. ГІЛЕВІЧ,**
**старшы выкладчык.**

**● ТВОРЧЫЯ СУВЯЗІ**

# ХВАЛЮЮЧАЯ СУСТРЭЧА

НЯДАЎНА ў сталіцы нашай рэспублікі праходзіла першая Рэспубліканская алімпіяда школьнікаў па беларускай мове. З усіх канцоў рэспублікі ў Мінск з'ехалася таленавітая вучнёўская моладзь — пераможцы і прызёры раённых, гарадскіх і абласных алімпіяд па беларускай мове.

Рэспубліканская алімпіяда школьнікаў мела на мэце не толькі выяўленне прызёраў і пераможцаў, але і шмат якія іншыя задачы: павышэнне агульнаадукацыйнага і прафесіянальнага ўзроўню будучых спецыялістаў у галіне роднай мовы і літаратуры, актывізацыю і ўдасканаленне форм і метадаў выкладання беларускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе, павышэнне якасці і эфектыўнасці ўрока, прывіццё вучням навыкаў самастойнага аналізу лінгвістычных з'яў і фактаў і інш. Алімпіяда з усёй відавочнасцю паказала, што прызёрамі і пераможцамі яе аказаліся выхаванцы тых перадавых школ рэспублікі, у якіх выкладанне роднай мовы вядзецца на высокім навукова-метадычным узроўні. Алімпіяда выклікала жывую зацікаўленасць настаўнікаў і вучняў да праблем вывучэння беларускай літаратурнай мовы, мовы мастацкай літаратуры, моўна-выяўленчых сродкаў мастацкіх твораў і народных гаворак.

У адпаведнасці з праграмай алімпіяды адбылася сустрэча яе ўдзельнікаў з прафесарска-выкладчыцкім саставам і студэнтамі філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Паміж школьнікамі і вучонымі адбылася сардэчная, шчырая гутарка аб падрыхтоўцы філолагаў ва універсітэце, аб іх вучобе і быце, аб ролі выкладчыцкага калектыву ў падрыхтоўцы высокаадукаваных спецыялістаў-філолагаў

З цёплымі словамі да ўдзельнікаў алімпіяды звярнуліся на сустрэчы вядучыя вучоныя факультэта. Загадчыкі кафедр В. В. Казлова і Л. М. Шакун расказалі прысутным аб дзейнасці кафедр беларускай літаратуры і беларускай мовы, аб важнасці пашырэння ў наш час філалагічнай адукацыі, аб высакароднай прафесіі настаўніка-філолага ў сярэдняй школе. Загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання прафесар М. Я. Цікоцкі расказаў аб вучобе і жыцці студэнтаў факультэта журналістыкі. Пра любоў да роднага краю і яго найвялікшага скарбу — мовы пранікнёна і хораша гаварыў вядомы літаратуразнаўца і пісьменнік прафесар С. Х. Александровіч.

Затым гучала паэзія. Старэйшы выкладчык факультэта прафесар М. Р. Ларчанка, прафесар А. А. Лойка, паэтэса Л. А. Тарасюк з вялікім натхненнем прачыталі свае творы і творы савецкіх аўтараў, падзяліліся з прысутнымі сваімі творчымі планамі. Горача і сардэчна віталі ўдзельнікаў алімпіяды студэнткі чацвёртага курса М. Варашкевіч і В. Русілка.

Удзельніца алімпіяды вучаніца 10-га класа з Пухавіцкага раёна Вольга Савасцюк, якая заняла першае месца сярод вучняў 10-х класаў, і вучаніца 10-га класа, прызёр алімпіяды Таццяна Каваленка з г. п. Крупкі Мінскай вобласці падзяліліся сваімі ўражаннямі аб алімпіядзе, чыталі свае вершы.

Творчая сустрэча вучняў 8—10-х класаў з вучонымі філалагічнага факультэта зрабіла незабыўнае ўражанне на ўсіх удзельнікаў Рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове. Многія з вучняў вырашылі пасля заканчэння школы паступаць на філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

**Я. КАМАРОЎСКІ,**
**член аргкамітэта алімпіяды, дацэнт.**

**У. ЛАЗОЎСКІ,**
**намеснік дэкана філалагічнага факультэта, дацэнт.**



**В. Маляваны і М. Сіняк, студэнты I курса фізфака, у лабараторыі малекулярнай фізікі.** Фота М. Дубовіка.

**● КОНКУРС**

# БАЛЬ ГРАЦЫЙ

НЯДАЎНА закончыліся двухдзённыя спаборніцтвы па спартыўных танцах на прыз «Кубак БДУ-80». Спаборнічалі танцоры класа «В». Пераможцы вызначыліся па выніках трох груп танцаў: савецкіх, заходнееўрапейскіх і лацінаамерыканскіх.

...На хвіліну яны застылі, увабраўшы ў сябе наступіўшую цішыню. Лёгкія, зграбныя, грацыёзныя. Першыя гукі. Не раз адрэпеціраваны рэверанс — і яны закружыліся, падхопленыя хваляй чароўных гукаў вальса. Навокал нічога не існуе. Музыка... Толькі музыка... Яна запоўніла танцораў...

Так пачаўся першы конкурс «Кубка БДУ-80», які арганізавалі студэнцкі клуб і прафком універсітэта. У конкурсе ўдзельнічалі 17 пар: з Кіева, Масквы, Вільнюса, Горкага, Каўнаса і Мінска.

Кубак гэтага спаборніцтва застаўся ў Мінску. Заняўшы першае месца ў выкананні стандартных танцаў, III — у лацінаамерыканскіх і IV — у савецкіх, галоўны прыз атрымалі Марына Продан — студэнтка V курса радыёфізічнага факультэта і выкладчык танцаў Аляксандр Пупа. Гэту пару падрыхтаваў кіраўнік народнай студыі бальнага танца ДК МТЗ балетмайстар М. Кац. Другая яго пара—А. Бялова і В. Лямешка — заняла першае месца ў выкананні лацінаамерыканскіх танцаў. Па выкананню савецкіх танцаў лепшай была танцавальная пара з Вільнюса Л. Мамленіс і Д. Паукшціт.

**Г. МІХНАВЕЦ.**
**(Прэс-цэнтр прафкома).**

# КАМЕРТОН
## МУЗЫЧНЫ КЛУБ

ВЫПУСК ДРУГІ

## Ленініяна ў грамзапісе

МАЛА ХТО з нашых сучаснікаў меў шчасце бачыць Уладзіміра Ільіча і слухаць яго выступленні. Да нашых дзён данеслі жывы голас Ільіча грампласцінкі.

60 гадоў назад, у сакавіку 1919 года, былі запісаны першыя прамовы У. І. Леніна — «III Камуністычны інтэрнацыянал» і «Зварот да Чырвонай Арміі». З 1919 па 1921 год было запісана 16 прамоў. Грампласцінкі разыходзіліся ў дзесятках тысяч экземпляраў; яны раздаваліся на агітпунктах, на сялянскіх сходах, у клубах, у часцях Чырвонай Арміі.

Апошняе выданне прамоў У. І. Леніна ў наш час з'яўляецца найбольш поўным.

Неад'емную частку Ленініяны складаюць запісы прамоў паплечнікаў Леніна. Гэтую серыю адкрывае пласцінка з прамовамі выдатнага дзеяча Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, прафесіянальнага рэвалюцыянера, жонкі і вернага памочніка Уладзіміра Ільіча Н. К. Крупскай.

Да 1919 года адносяцца першыя запісы прамоў М. І. Калініна.

Збор фрагментаў прамоў А. В. Луначарскага прадстаўлены асобнай доўгаіграючай пласцінкай. Адзін з ранніх запісаў адносіцца да 1919 года. Падзяляючы адносіны Уладзіміра Ільіча да грампласцінкі як важнага сродку прапаганды, Анатолій Васільевіч адзначаў: «...Калі радыё з'яўляецца вялікай перамогай над прасторам, дык яно бяссільна перад часам. Ваша прамова, ваша песня гучыць да таго моманту, пакуль вы гаворыце каля мікрафона. У гэтых адносінах вялікую перамогу не толькі над прасторам, але і над часам атрымлівае грамафон».

З адной з пласцінак гэтай серыі гучыць голас выдатнага трыбуна рэвалюцыі, першай жанчыны-дыпламата Аляксандры Міхайлаўны Калантай. І сёння яна ўражвае слухачоў сваёй энергіяй, пафасам, перакананасцю.

Вялікую цікавасць уяўляюць таксама пласцінкі: «С. М. Кіраў», «Р. К. Арджанікідзе», «Мікалай Бауман» і інш.

З кожным годам ва ўсім свеце ўзрастае інтарэс да вывучэння біяграфіі У. І. Леніна. Фірма «Мелодыя» выпускае альбомы пласцінак «Сустрэча з Леніным».

Аб Леніне расказваюць пласцінкі «У барацьбе за партыю», «Ленін у трох рэвалюцыях», «Сцяг над барыкадамі».

Ленініяна — гэта не толькі дакументальныя запісы, гэта і ўрыўкі з кінафільмаў, літаратурна-музычныя кампазіцыі савецкіх пісьменнікаў.

Пласцінкі Ленініяны дапамагаюць адкрыць новыя рысы ў светлым вобліку правадыра.

Работа над Ленініянай не закончана. Працягваецца пошук і рэстаўрацыя прамоў У. І. Леніна, рыхтуюцца да выпуску ўспаміны старых бальшавікоў аб Уладзіміру Ільічу, пласцінка з запісам літаратурных твораў аб Леніне і інш.

# МУЗЫКА ПРАТЭСТУ

**СЁННЯ МЫ ПАЧЫНАЕМ ДРУКАВАЦЬ МАТЭРЫЯЛЫ, ПРЫСВЕЧАНЫЯ ШМАТЛІКІМ НАПРАМКАМ, ЯКІЯ ІСНУЮЦЬ У СУЧАСНАЙ ПАПУЛЯРНАЙ МУЗЫЦЫ. НАШ ПЕРШЫ РАСКАЗ—АБ СВОЕАСАБЛІВЫМ «ПІЯНЕРУ» ПОП-МУЗЫКІ—СТЫЛІ «РОК».**

Што такое «рок»?

Пэўнага адказу, які б задаволіў кожнага, няма. Бо кожны па-свойму ўспрымае яго. Але...

Пачатак 50-х гадоў, Паўночная Амерыка. Музычнае жыццё тут уяўляла і ўяўляе зараз даволі стракаты малюнак. Як па форме, так і па сутнасці. Час ідзе, штосьці застаецца і замацоўваецца, а штосьці знікае назаўсёды.

Рок застаўся. Ён з'явіўся выдатным спалучэннем, сінтэзам афрыканскіх і еўрапейскіх традыцый у музыцы. Прычым само слова «рок» было ўзята з папулярнай у той час песні амерыканскага спевака Біла Халі «Рок — біт-бугі». Там ёсць такія радкі: «Рок, рок, рок усюды...». Яны паўтараліся ў гэтай песні вельмі часта і таму надоўга запомніліся слухачам. Сам жа Біл Халі прытрымліваўся негрыцянскай музыкі «рытм і блюз». Гэта, безумоўна, рабіла яго творы больш разнастайнымі і цікавымі. Біл Халі стварыў сваю школу — школу рока, з якой потым выйшаў на сусветную эстраду кароль рок-н-рола Элвіс Прэслі, Літл Рычард, Чак Бэры і іншыя выканаўцы. Яны бралі з негрыцянскай музыкі асобныя элементы і ўключалі іх у свае рок-кампазіцыі.

Развіццё тэхнікі і сацыяльная сітуацыя ў 50—60-х гадах адыгралі ролю каталізатара ў развіцці рока як стылю. Гэта быў не джаз, лепшым музыкантам якога спатрэбілася больш трыццаці год, каб у 1935 годзе пад назвай «Свінг» выйсці на вялікі камерцыйны рынак Амерыкі. Гэта быў рок. І новая рок-музыка атрымлівала імгненнае распаўсюджанне: праз грампласцінкі, радыё і асабліва дзякуючы тэлебачанню. Рок стаў музыкай пратэсту. Пратэсту моладзі супраць капіталістычнага грамадства. Пратэсту супраць музыкі, якая існавала раней і да якой прывыкла старэйшае пакаленне.

Стагоддзе дыктавала свае ўмовы. Рэвалюцыя ў прамысловасці, кібернетыка і аўтаматызацыя, развіццё і пашырэнне рэкламы, ажыўленне бізнесу ў вялікіх гарадах — усё гэта ўплывала на фарміраванне густу і развіццё тых ці іншых эстэтычных ідэалаў у моладзі. І таму большая частка яе ўжо стала адмаўляцца ад духоўных каштоўнасцей сваіх бацькоў. Гэта прывяло да таго, што пасля 1955 года вялікая колькасць юнакоў і дзяўчат пачала праводзіць свой вольны час на рок-канцэртах, дыскатэках...

Але не толькі элементы музыкі былі ўзяты з афрыканскай культуры, не засталася ў баку і пластыка чароўных негрыцянскіх танцаў. Гэта быў рытуал. Італьянскі пісьменнік Веспігнані пісаў: «Яны танцуюць так, нібы наступаюць на спіну ворага, якога перамаглі. І мне здаецца, што гэты вораг —пакаленне, якое адыходзіць».

У гэты час усё ўзрастаючая колькасць моладзі адчувае патрэбу ў кантактах паміж сабой. Спрыялі гэтаму поп-канцэрты, рок-фестывалі, дыскатэкі. Тут можна было пазнаёміцца і абмеркаваць хвалюючыя, надзённыя пытанні жыцця. Большасць такой моладзі складалі, безумоўна, студэнты. Пасля лекцыі трэба было дзе-небудзь праводзіць свой вольны час, трэба было некуды дзецца сябе. А рок-музыка, якая толькі пачала сваё бурнае развіццё, прыцягвала іх і з'явілася доўгачаканай крыніцай адпачынку. У ёй усё адпавядала патрабаванням моладзі: і рытм, і тэкст песень, вельмі наближаны да звычайнай гутаркі.

Так пачалася рок-музыка. Такімі былі яе вытокі. Такія былі яе першыя выканаўцы.



### ● НАШЫ ГОСЦІ

**...Да мікрафона падыходзіць дзяўчына з крыху стомленым, але выразным тварам. На хвіліну ў зале ўсталёўваецца цішыня. Загучала песня... А потым зала ўзрываецца апладысментамі. Спявае Алена Камбурава.**

**Алена Камбурава сустракаецца са студэнтамі нашага універсітэта ўжо не першы раз. І заўсёды яе выступленні знаходзяць зацікаўленых слухачоў. У праграме канцэрта песні Булата Акуджавы, кампазіцыі на вершы Андрэя Вазнясенскага, рускія народныя песні.**

**Гэты здымак быў зроблены ў час яе выступлення ва універсітэце.**

## ПАНАРАМА

У КАНЦЫ МІНУЛАГА года ў горадзе Карл-Маркс-Штат адбыўся конкурс дыскатэк. На ім былі прадстаўлены лепшыя дыскатэкі Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Цікава, што адзін з кіраўнікоў дыскатэкі «Кантакт» з акругі Дрэздэн Вольфганг Вейнерт некалькі год вучыўся ў Ленінградзе, дзе і стварыў першую гарадскую студэнцкую дыскатэку. Зараз дыскатэка «Кантакт» працуе над праграмай для турыстаў з Савецкага Саюза

* * *

ЗАПІС ЗВЫЧАЙНАЙ пласцінкі ў наш час з'яўляецца надзвычай складанай справай. Так, напрыклад, вядомаму французскаму поп-музыканту Жану-Мішэлю Жарэ для запісу свайго дыска «Кісларод» спатрэбілася каля 16 розных сінтэзатараў, прычым запіс вёўся на 32 дарожках спецыяльнага магнітафона.

* * *

ВЯЛІКІМ СЮРПРЫЗАМ для аматараў сучаснай музыкі з'явіўся выхад альбома амерыканскага спевака Стыві Вондэра «Падарожжа ў таямніцы жыцця раслін». Ён цалкам уключаны ў кінафільм аб таямнічым свеце раслін. Гэты альбом, над якім Стыві Вондэр працаваў тры гады, з'яўляецца сур'ёзным крокам уперад у яго творчасці.



**«Верасы»... Мы добра ведаем іх. Яны нашы старыя знаёмыя. І таму кожная сустрэча з імі ператвараецца ў сапраўднае свята. Свята музыкі і пачуццяў. Яны лаўрэаты пятага Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады, лаўрэаты міжнароднага фестывалю палітычнай песні ў Хельсінкі. Зараз іх канцэртны рэпертуар значна пашыраны. У яго ўваходзяць песні савецкіх кампазітараў і замежных выканаўцаў. Але кожнае сваё выступленне калектыў пачынае з песні «Верасы», якая з'яўляецца своеасаблівай візітнай карткай ансамбля. І гэта невыпадкова, бо ў ёй вельмі дакладна перададзены характар, твар ансамбля: імклівы і лагодны, меладычны і вясёлы, павольны і рытмічны.**

**Нядаўна ансамбль «Верасы» Беларускай дзяржаўнай філармоніі быў госцем нашага універсітэта. Пасля канцэрта кіраўнік ансамбля Валерый Раінчык пакінуў свой аўтограф:**

● АЎТОГРАФ ●






**«Птушка шчасця ляціць над зямлёй. Людзі глядзяць на яе і радуюцца жыццю», — пяецца ў мадагаскарскай народнай песні, якую выконваюць Эжэн Ракутумамундзі, Вільям Фітахіа і Марсель Разафі. Нядаўна ўсе яны сталі пераможцамі агульнауніверсітэцкага конкурсу палітычнай песні.**

**Дзяжурныя па клубу В. КІРЫЛЬЧЫК і С. ЛЫСКАВЕЦ.**

Фота **А. Стадуба.**

### АБ'ЯВЫ

УВАГА! «Камертон» прапануе ўсім аматарам сучаснай музыкі конкурс, вынікі якога будуць падводзіцца ў канцы года.

**1. Лепшы, на ваш погляд, ансамбль года**

**а) савецкі**

**б) замежны**

**2. Кампазітар (а, б)**

**3. Выканаўца (а, б)**

**4. Лепшая песня года (а, б)**

Аб пераможцах конкурсу мы раскажам у выпусках «Камертона».

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

АТ 10632 Заказ 616.

10 красавіка 1980 г.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ